## Ганад Чарказян



...Ростань доўгая не патушыць
З дому роднага цёплы прамень...

# Чаргаві

*З курдскай пераклаў Рыгор БАРАДУЛІН.*

*Малюнкі Каміля КАМАЛА.*

***Крокі насустрач наступнасьці...***

Сам кон блаславіў Ганада Чарказяна быць ранішняй памяцьцю й вечаровым роздумам свайго народу.

Невыпадкова неяк падчас размовы Ганад інтэлігентна, але цьвёрда заўважыў: «За мной сорак мільёнаў». І невыносна цяжка насіць у трапяткім сэрцы свой абражаны край, свой народ, матчыну мову. Здарылася так, што ў курдаў укралі іхнюю дзяржаўнасьць, а значыць, і свабоду. Васіль Быкаў, хто адным з першых добраслаўляў кнігі паэзіі Ганада Чарказяна, прыводзіў лёс курдаў як сумны прыклад таго, што робіцца з народам, у якога няма сваёй дзяржавы. Беларусь стала для курдскага паэта гасьціннай хатай, у якой нарадзілася дачушка ад беларускай красуні і нараджаюцца вершы, апавяданьні.

Вынайшаў Ганад і свой жанр у паэзіі — чаргаві. Па-курдску гэта значыць — чатыры крокі. Чатыры крокі ў глыбіню спрадвечча, чатыры крокі насустрач наступнасьці, чатыры крокі ў патайнікі сваёй балючай і чулай душы, чатыры крокі па крутых сьцяжынах у гарах паэзіі.

А наогул чатыры — лічба стабільнасьці, грунтоўнасьці, трываласьці. Чатыры канцы сьвету, чатыры паравіны году, чатыры вуглы хаты, чатыры рагі стала.

У Ганадавых чаргаві — споведзь, сподзеў, роздум, запавет, смутак і ўсьмешка.

Чаргаві — радня рубаі. Я пераклаў кнігу «Чаргаві» і як бы рэцэнзію напісаў:

Чарказян у сваіх чаргаві
З паняй мудрасьцю візаві.
Ды цікавіць мяне аж занадта,
Што сказаў бы Хаям пра Ганада?

**Рыгор БАРАДУЛІН.**



* * *

Вачэй тваіх зорная глыбіня —
Нырнуць бы й не вяртацца назад.
Сьвет кожны па-свойму бачыць штодня,
Хто цуда ў нябёсах, хто — зоркапад.

* * *

Наканаваньня ніхто не міне.
Ніхто не расчуліць спатолю.
У ранішнім сьне, быццам у тумане,
Чалавек і прасьпіць сваю долю.

* * *

І Месяц, і зоркі мільёны гадоў
Свайго не мяняюць месца.
А чалавек, падацца гатоў
Дзе лепей і п’ецца, і есца.

* * *

Віно ці гарэлку мы п’ем да дна,
Для ганьбы і славы адна пара.
І доля, і сутнасьць здаўна у збана
У часе сваім і ў руках ганчара.

* * *

Заселена зоркамі неба начное,
Зьлічыць іх нікому жыцьця нестае.
Дарагая таму чалавечая мроя,
Што не дасягнуць у жыцьці яе.

* * *

Чалавек — сваёй прывіднай мроі раб,
Нараджаецца голым, пяшчотным.
А сталее і ў золата здобіцца, каб
У зямлі стацца прахам потым.

* * *

Праліта колькі сьлёз жыцьцём маім,
Ты ведаеш адзін, мой родны Краю.
Але дарую ворагам сваім,
Якіх ня ведаю і ведаць не жадаю.

* * *

Зоркі бачаць нашых мрояў вышыню.
Мы шчасьлівыя да змоўкласьці ўжо тым.
Не заўсёды можна грэцца ля агню,
Дзе далёка ўецца дужа цёплы дым.



* * *

Раніцой па расе басанож —
Ад грахоў зямных ачышчэньне.
Сум бясконцы начны мой усё ж
На пялёстках халодзіць трымценьне.

* * *

Цярплівыя й халодныя адны
Сівыя камяні ва ўсе часіны.
А чалавек з сівое даўніны
То стыне, то гарыць з любой прычыны.

* * *

Нязручна наступаць на граблі двойчы.
А дзе дарогі гладкія ў жыцьці,
Каб ані пазычаць у страха вочы
І незаўважна граблі абысьці?

*   *   *

Марская роўнядзь поўніцца пяшчотай.
Прыстала хвалі лашчыць далягляд.
Дзе чалавек той, што з сваёй самотай
Стаяў тут тысячу гадоў назад?

*   *   *

Сьвет цесны стаў і для жыцьця й для сьмерці
Бязьмежжа дол пакінула даўно.
Свае сьляды дзень учарашні сьцерці
Сьпяшаецца. І нашы заадно.

*   *   *

Чалавеку быць верным спагадзе
няўзмогу.
Спачувае ня кожны суседу ў бядзе.
Кожны вольны сваю выбіраць дарогу.
Важна толькі — куды яна прывядзе.

*   *   *

З нас кожны, вядома, шчасьця чакае,
Ды навыперадкі сьпяшае бяда.
Кожны прагне сустрэчы хоць ля
небакраю,
Ды яму насустрач выходзіць нуда.



*   *   *

Чалавек хацеў бы сабакам быць,
Ды забыўся, што гаўкаць прымусяць
людзі.
Чалавек хацеў бы сонцам сьвяціць —
Жменькі попелу ад яго ня будзе.

*   *   *

Падрастаючы, людзі, як птушкі,
Пакідаюць родны агмень.
Ростань доўгая не патушыць
З дому роднага цёплы прамень.

*   *   *

Засынаем з надзеяй, што заўтра ўвесь
сьвет

Зьменіцца, як у казцы чароўнай.
А прачнемся — шукаем заблытаны сьлед
Ісьціны непадступнай, няўлоўнай.

* * *

Сьпяшаецца ўнучка старанна
Свой дом збудаваць з паперы.
Храм узводзіць ніколі ня рана
На цьвёрдым падмурку веры.

* * *

Не для розуму й не для сьвятла
Цемра вечная. Нашыя справы
Усе з двуякім абліччам, каб цемра магла
Песьціць абыякавасьці праявы.

* * *

І колькі жывем, няўцям,
Чаму мы — пасынкі долі.
Нам рады хіба што там,
Дзе нас ня будзе ніколі.



* * *

Пакахаў — пашанцавала табе,
А не пакахаў — воля лёсу.
Жыць і паддавацца журбе,
Хоць бы ўсё згубіць давялося.

* * *

Дарога для самаўцямленьня — час,
Дарога для самасьцьверджаньня —
праца.
Згубіў свой час — промень спадзеву згас.
Няма дарог, каб назад вяртацца.

* * *

Кожны, хто душой сваёй юнак,
У галінку бэзу закахаецца.
Толькі ён адзін убачыць, як
Вогнішча каханьня разгараецца.

* * *

Дзе карані крыніцы цеплыні,
Што грэе нас і беражэ ад сьцюжы.
Час і адлегласьць — сум пустой сяўні.
Чые глыбока карані, той дужы.

* * *

Спадзяваньнем жывем ашукаць забыцьцё
І кунежым ружовыя крозы.
Ды чакаем дарэмна, бо наша жыцьцё —
Ашуканства, ростані, сьлёзы.

* * *

Каб мог чалавек здалёк
Зірнуць на сябе самога,
Убачыў бы зайздрасьць і змрок
Самазьнямоглы нябога.

* * *

Тысячагоддзямі не зьлічыць,
Колькі ля самага краю
Чалавецтва над прорвай стаіць,
І толькі вера яго трымае.

* * *

Баіцца вольнага ветру глухое тхло.
Чужога парога ня любіць зьнямога.
Калі чалавек на сьвеце шукае сьвятло,
Яму дапамагае трывога.



* * *

На дарогах вечна глухіх пустых
Спадарожнікаў часта чакаем.
Невядомасьць чакае ўсіх,
А яе мы не запрашаем.

* * *

Час чысьціць крыніцу, каб людзі пілі
Засьмяглыя з поўнага гарца.
Як добра крыніцай пражыць на зямлі,
Чакаючы ціхага старца.

* * *

У пустой душы, нібыта ў хаце,
Дзе начуюць халады зімовыя.
Сэнс жыцьця, вядома, не ў багацьці,
Хоць ад яго ніхто і не адмовіўся.

* * *

Вяртацца горка туды, дзе пагасла
сьвечка
І полымя ў агменю патухла.
Блукаць чалавеку даводзіцца вечна,
А дома чакае глухая скруха.

* * *

Навобмацк дом бацькоўскі пазнаваў,
І ў цемры мне сьвяціўся кожны камень.
Цяпер заплюшчу вочы — і наўяў
Абдыме сум халоднымі рукамі.

* * *

Хто прачнуўся — ўдача жадае яму:
Мрой, кахай і стварай нанова.
Вечар хутка настане — й твайму ўсяму
Цемра ў вочы зірне сурова.

* * *

Дарогі да дабра вядзе зямля,
Калі за пазухай ня камень — галубок.
А колькі будзе дзён маіх пасьля,
Пра гэта ведае Вялікі Бог.

* * *

Розум дадзены людству для добрых
спраў,
Неўміручасьць затуліць ніву жыцьця.
У вяках застанецца той, хто ствараў,
І зьнясе марнатраўца рака забыцьця.

